**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Теоретические основы процесса обучения в советской школе / [В.В. Краевский, И.Я. Лернер, И.К. Журавлев и др.]. – М. : Педагогика, 1989. – С. 187. – (Образование. Пед. науки. Общ. педагогика).
2. Тамсама, с. 189.
3. Проблемы школьного учебника. Вып. 1–14. – М. : Просвещение, 1973–1984.

# ТРАДЫЦЫЙНЫ КАЛЯНДАР БЕЛАРУСАЎ: ГІСТАРЫЧНЫ ВОПЫТ І ПЕРСПЕКТЫВЫ АКТУАЛІЗАЦЫІ

## (ДА ВЫДАННЯ СЕРЫІ "БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР")

***Катовіч Аксана Веніямінаўна,*** *магістр педагагічных навук, выкладчык кафедры этналогіі і фальклору;*
***Крук Іван Іванавіч,*** *кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Гісторыя збірання твораў беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі і вывучэння ўсіх складнікаў міфарытуальных комплексаў налічвае больш за два стагоддзі. У той ці іншай ступені да гэтай праблемы мелі дачыненне ўсе знакамітыя і вядомыя толькі па адзінкавых публікацыях збіральнікі вусна-паэтычнай спадчыны беларускага народа. Дастаткова назваць прозвішчы М. Чарноўскай, З. Даленгі-Хадакоўскага, К. Фалютынскага, А. Мухлінскага, Я. Баршчэўскага, Л. Галэмбёўскага, Р. Зянькевіча, П. Шпілеўскага, П. Бяссонава, П. Шэйна, Е. Раманава, А. Шлюбскага, М. Дзмітрыева, І. Бермана, І. Насовіча, Ю. Крачкоўскага, З. Радчанка, М. Янчука, Я. Карскага. Пачынаючы з 70-х гг. XX ст. беларускі земляробчы каляндар становіцца аб'ектам больш дэталёвага навуковага даследавання. Аднак такія навукоўцы, як А.І. Гурскі, А.С. Ліс, Г.А. Барташэвіч, А.С. Фядосік, Л.М. Салавей займаюцца даследаваннем асобных фальклорных жанраў, тэматычна звязаных з цыкламі каляндарна-абрадавай паэзіі: зімовай, веснавой, летняй і восеньскай. На пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя даследчыкі А.Ю. Лозка, У.А. Васілевіч, В.Дз. Ліцьвінка, В.С. Новак зрабілі першыя спробы абагульніць назапашаныя матэрыялы і прааналізаваць асноўныя святочна-абрадавыя комплексы традыцыйнага земляробчага календара беларусаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У гэты самы час вялікую ўвагу да збірання і вывучэння каляндарнай спадчыны беларуска-ўкраінскага Палесся выяўляюць маскоўскія этналінгвісты пад кіраўніцтвам акадэміка М.І. Талстога. Вынікам дзейнасці школы этналінгвістаў сталі шматлікія манаграфіі, зборнікі артыкулаў, выдадзеныя напрыканцы XX – пачатку XXI стст. Адной з апошніх з’явілася грунтоўная праца М.І. Талстога “Палесскі народны каляндар”, у якой надзвычай шырока прадстаўлены рэгіянальны эмпірычны матэрыял, а таксама шэраг артыкулаў, прысвечаных асобным праблемам упарадкавання народнага календара.

Важным этапам у вывучэнні каляндарна-абрадавай паэзіі беларусаў стала калектыўнае даследаванне, здзейсненае навукоўцамі-фалькларыстамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Усе гэтыя даследаванні былі скіраваны на тое, каб перш за ўсё прааналізаваць генезіс таго ці іншага свята, вылучыць яго асноўныя структурныя кампаненты, разгледзець сістэму вобразаў і мастацкі свет абрадавых песняў. Даследаванні нашых шматлікіх папярэднікаў з’явіліся своеасаблівым завяршальным этапам у вывучэнні асобных цыклаў-сегментаў традыцыйнага – і найперш земляробчага – календара.

Дзякуючы гэтаму з’явілася рэальная магчымасць перайсці да падрыхтоўкі канцэптуальнага вывучэння беларускага народнага календара як гарманічнай, упарадкаванай сістэмы сацыякультурных каштоўнасцяў, як вялікага, дэталёва прапрацаванага кола часу, у якім сфакусаваны самыя розныя па працягласці і ідэйнай напоўненасці адрэзкі, перыяды, сегменты ўпарадкаванасці прыродна-касмічнага і родава-абшчыннага часу.

У 2002 г. выдавецтва “Мастацкая літаратура” прапанавала абмеркаваць праект падрыхтоўкі пяцітомавага выдання “Беларускі народны каляндар”. Ідэя падалася нам прывабнай і маштабнай: яшчэ ніхто не спрабаваў прааналізаваць традыцыйны беларускі народна-праваслаўны каляндар з пазіцый яго генезісу, рознастадыяльнага фармавання, дыялогу язычніцкай і хрысціянскай культур, дэталёвага і скрупулёзнага разгляду кожнага рытуальна-абрадавага комплексу паасобку і адначасова ў шматгранных узаемасувязях з іншымі міфарытуальнымі падзеямі.

У 2003 г. выйшла з друку першая кніга шматтомавай серыі – “Зімовыя святы”, потым у 2004 г. – “Веснавыя святы” [1]. Напрыканцы 2006 г. павінен выйсці з друку чацвёрты том серыі – “Летнія святы”, а ў 2007 г. з’явіцца заключная частка, прысвечаная восеньскім святам традыцыйнага календара нашага народа.

Распачынаючы працу над вывучэннем асаблівасцяў структуравання часу, асобных сегментаў календара і заканамернасцяў разгортвання рытуальна-абрадавых (міфа-рытуальных, святочна-абрадавых або фальклорна-этнаграфічных) комплексаў, мы вырашылі даць панарамную карціну этнічнага светаўспрымання і светаадчування, заснаванага на гармоніі прыродна-касмічнага суладдзя. У сувязі з гэтым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акрэслілася некалькі канцэптуальных, асноватворных сілавых ліній.

Па-першае, захоўваючы традыцыі структуравання календара па порах года, мы, тым не менш, прапанавалі абмеркаваць тэорыю каляндарных сегментаў, якая асэнсоўвае прамежкі не толькі прыродна-каляндарнага, але і родава-абшчыннага часу, у структуру якога даволі часта траплялі не толькі земляробчыя, а і шэраг аказіянальных святаў, а таксама водгукі той сівой даўніны, калі ў аснове календара яшчэ не ляжалі прыярытэты земляробства, напрыклад, Камаедзіца, Грамніцы, абрад выклікання дажджу. Уласна сегментарны падыход дазволіў у некаторых выпадках перанесці акцэнты ў далучэнні асобных святаў да той ці іншай пары года. Зразумела, што Тройца, якая магла часам святкавацца перад самым Купаллем, не магла класіфікавацца як уласна веснавое свята.

Па-другое, прынцыповае адрозненне нашага падыходу ў тым, што кожны каляндарны сегмент падаецца / разглядаецца ў двух ракурсах. У “ніжнім” гарызонце падаецца штодзённы хранаметраж часу. Вызначаецца міфапаэтычная і хрысціянізаваная характарыстыка кожнага дня, прычым у трох плоскасцях:

– рэгулятыўна-нарматыўны аспект раскрывае асноўныя карэлятывы залатых правілаў народнай культуры, рытуалы, абрады, якія выконваліся ў гэты дзень, акрэсліваецца кола забаронаў, звязаных з паводзінамі і працоўнай дзейнасцю чалавека;

– функцыянальна-побытавы аспект факусуе асаблівасці хатніх клопатаў гаспадароў;

– сакральна-магічны і прадукавальна-прэвентыўны аспект закранае праблемы здароўя чалавека, сям’і, хатняй жывёлы.

У “верхнім” гарызонце даецца падрабязны аналіз найбольш значных каляндарных рытуальна-абрадавых комплексаў: структура, час і месца правядзення, галоўная ідэя, храналогія падзей, персанажы-ўдзельнікі,  асноўныя атрыбуты, асаблівасці адзення, рытуальныя стравы, забароны, перасцярогі.

Па-трэцяе, наш шматтомавік мае пяць частак (а не чатыры, калі адштурхоўвацца ад традыцыі земляробчых сезонаў), таму што ў веснавым сегменце ёсць два асобныя цыклы народна-хрысціянскіх святкаванняў. Адзін з іх складаюць рухомыя святы, падпарадкаваныя хрысціянскай Пасхаліі, другія – у аснове якіх ляжыць дахрысціянскія падзеі і святкаванні – засталіся нерухомымі.

Па-чацвёртае, кожны чарговы том распачынаецца фрагментамі асэнсавання асобных адзінак часу – год, месяц, суткі, якія ўзніклі на аснове прыродна-касмічных рытмаў – перыядаў поўнага абарачэння Сонца і фазаў Месяца. Пры гэтым кожны з іх атрымаў выключную трактоўку ў культуры беларускага народа.

Па-пятае, шматлікія каляндарныя падзеі, выкарыстанне розных побытавых рэчаў у якасці сакральна-магічных атрыбутаў разглядаюцца на шырокім культуралагічным фоне і самой гісторыі традыцыйнай культуры. Аўтараў даследавання цікавілі семантычныя гарызонты характару таго ці іншага рытуалу, а таксама глыбінная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімволіка абрадавых дзеянняў і атрыбутаў.

Па-шостае, мы ставілі перад сабой мэту паказаць нашым сучаснікам, што традыцыйны каляндар і ў наш час не страціў сваю актуальнасць і павінен у той ці іншай ступені займаць месца ў жыцці нашага грамадства, а найперш – у выхаваўчым працэсе ў сям'і і школе.

Па-сёмае, у народнай культуры ў цэлым і ў традыцыйным календары ў прыватнасці адлюстраваўся і захаваўся ўвесь папярэдні вопыт суіснавання этнасу ў Богам дадзеным яму наваколлі, сфакусаваліся асаблівасці менталітэту, талерантнасці, творчага пошуку. Таму, мы ў гэтым глыбока перакананы, шматвяковы вопыт, сканцэнтраваны ў святах і абрадах календара, павінен самым актыўным чынам выкарыстоўвацца ў выпрацоўцы нацыянальнай ідэі і фармаванні ідэалогіі нашага сучаснага грамадства.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Катовіч А. Зімовыя святы / Аксана Катовіч, Янка Крук ; маст. У. У. Васюк, А. Л. Баранаў. – Мн. : Маст. літ., 2004. – 119 с. – (Беларускі народны каляндар), Катовіч А. Зімовыя святы : нарысы : у 2 т. / Аксана Катовіч, Янка Крук ; маст. У. У. Васюк, А. Л. Баранаў. – Мн. : Маст. літ., 2005. – Т. 1–2. – (Беларускі народны каляндар).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРОБЛЕМНО-ТЕМАТИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ПРОЦЕССА ФОРМИРОВАНИЯ НАЦИОНАЛЬНЫХ, ЗАРУБЕЖНЫХ КАТАЛОГОВ ДУХОВОГО ИСКУССТВА И ИХ СОЦИОКУЛЬТУРНАЯ ЗНАЧИМОСТЬ

***Коротеев Александр Леонидович,*** *кандидат искусствоведения, доцент кафедры духовой музыки Белорусского государственного университета культуры и искусств*

В современных условиях развития общества профессиональный рост и уровень эрудиции любого специалиста во многом обусловлен оперативным поиском необходимой информации по проблемам развития отрасли, в которой он работает, и возможностью последующего использования наиболее оптимального материала из всего полученного объема информации в своей профессиональной деятельности. Существенную роль в профессиональном становлении специалиста играют, на наш взгляд, различные виды каталогов. Исходя из профессиональных интересов, предметом нашего исследования является духовое искусство, а объектом выступает проблема формирования различных каталогов